ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА
по дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі
і адукацыі

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасцям і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыя Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» адпавядае спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі і галіне навук – «Педагагічныя навукі». Дадзеная дысертацыя па сваёй сутнасці з'яўляецца гісторыка-педагагічным даследаваннем, прысвечаным гісторыі адукацыі. Даследаванне гісторыі адукацыі згодна з пашпартам спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі (загад ВАК ад 23 кастрычніка 2018 г. № 245) прадугледжвае аналіз гістарычнага развіцця інстытуцыялізаванай і неінстытуцыялізаванай практыкі адукацыі, дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і яе нарматыўна-прававога рэгулявання. Дысертацыя Панова С. В. у сваёй назве «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» адлюстроўвае вышэйпрыведзенае палажэнне. У змесце дысертацыі адлюстравана развіццё школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай шматкампанентнай інстытуцыялізаванай педагагічнай сістэмы, якая мае сацыяльна-гуманітарны характар. У главе 1 дысертацыі ахарактарызавана дзяржаўная гістарычная палітыка ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена наспеўшай мэтазгоднасцю даследавання працэса станаўлення і развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, які ажыццяўляецца на падставе дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, праводзімай у адпаведнасці з Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010 г., 2024 г.) і накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі і беларускай мадэлі гістарычнай памяці.

Вызначэнне саіскальнікам канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы абгрунтавана глыбокімі зменамі ў яе мэтавызначэнні, прынцыповым абнаўленнем зместу адукацыі і рэалізацыяй прадметна-гістарычных падыходаў да яго канструявання з улікам комплекса прынцыпаў яго адбору, мадэрнізацыяй структуры адукацыі на аснове канцэнтрычнага падыходу на трох яе ступенях.

Актуальнасць тэмы дысертацыі таксама праяўляецца ў рэалізаваным саіскальнікам падыходзе да даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы, што адлюстравана ў главе 3 дысертацыі праз характарыстыку і рэалізацыю ў змесце адукацыі канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі, нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Падобны аспект даследавання дазваляе вызначыць перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі пры фарміраванні механізмаў пераемнасці гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як сацыяльнага вопыту беларускага грамадства, які транслюецца ў сучаснай міжпакаленнай камунікацыі. Таксама даследаванне школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы спрыяе працэсу фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў сродкамі школьнай гістарычнай адукацыі.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена працэсам рэалізацыі Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. Школьная гістарычная адукацыя будзе больш эфектыўна выконваць сваю светапоглядна-выхаваўчую функцыю на падставе сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі. Саіскальнік прымаў удзел у распрацоўцы гэтай мадэлі ў межах навукова-даследчай работы «Навукова абгрунтаваць і распрацаваць мадэль патрыятычнага выхавання моладзі Рэспублікі Беларусь да 2025 г.» № 20211298, што прадстаўлена ў главе 4 дысертацыйнага даследавання.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Навуковая навізна дысертацыі як гісторыка-педагагічнага даследавання забяспечваецца рэалізацыяй міждысцыплінарнага падыходу, які ўлічвае метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі у сукупнасці з метадалагічнымі прынцыпамі гістарычнага пазнання. Пры гэтым саіскальнікам выкарыстаны метадалагічныя падыходы, якія адносяцца да акадэмічнай гістарычнай навукі і рэалізуюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны); прадметна-гістарычныя падыходы, якія адпавядаюць дыдактыкі гісторыі (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны); агульнапедагагічныя падыходы (культуралагічны, кампетэнтнасны).

У дысертацыі школьная гістарычная адукацыя ўпершыню ў навуцы пазіцыяніруецца як комплексная педагагічная сістэма на трох ступенях агульнай сярэдняй адукацыі з улікам трох канцэнтраў: першага канцэнтра ў пачатковай школе пры прапедэўтычным вывучэнні вучэбнага прадмета «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» (IV клас); другога канцэнтра пры сістэмным падзейна-храналагічным вывучэнні сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі (V–IX клас); трэцяга канцэнтра пры праблемна-тэарэтычным вывучэнні гісторыі (X–XI клас).

Школьная гістарычная адукацыя ўпершыню ахарактарызавана з пазіцыі яе вывучэння як шматкампанентнай педагагічнай сістэмы, якая складаецца з канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў, выяўленых і ўдакладненых саіскальнікам. Распрацаваная ў дысертацыі мадэль працэса развіцця школьнай гістарычнай адукацыі структуравана ў адпаведнасці з вышэйадзначанымі кампанентамі і адпавядаючымі ім фактарамі: распрацоўка канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі; дзяржаўная гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь; нацыястваральны патэнцыял айчыннай гісторыі; змест адукацыі як сацыяльны вопыт, які трансліруецца з улікам пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства.

Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону, заключаецца ў распрацаванай саіскальнікам перыядызацыі працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Прапанаваная перыядызацыя ўлічвае комплекс фактараў – сродкаў паспяховай рэалізацыі школьнай гістарычнай адукацыі: тры пакаленні канцэпцый іадукацыйных стандартаў, пяць пакаленняў школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; канцэнтрычны і лінейны прынцыпы структуравання зместу; культуралагічны і кампетэнтнасны падыходы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Упершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі яна комплексна абгрунтавана як інстытуцыянальна-ведамасная сістэма і як сацыягуманітарная з'ява. Прынцыпова новыя вынікі дысертацыі як міждысцыплінарнага даследавання дасягнуты праз характарыстыку канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі, нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Канцэптуальнае значэнне мае характарыстыка саіскальнікам працэса зместава-намінатыўнага вызначэння нацыянальнай (агульнанацыянальнай) ідэі як асновы для канструявання сучаснай педагогікі і як светапогляднай асновы ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, грунтуюцца на міждысцыплінарным характары гісторыка-педагагічнага даследавання. Гэты падыход дазваляе спалучаць метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць) і метадалагічныя прынцыпы гістарычнага пазнання (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае

абгрунтаванне, гуманізм, шматфактарнасць). Саіскальнікам рэалізаваны прынцып міждысцыплінарнасці пры характарыстыцы канцэптаў, якія адносяцца да акадэмічнай гісторыі, паліталогіі, сацыялогіі, і рэалізаваны ў змесце школьнай гістарычнай адукацы як сацыягуманітарнай з'явы.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, абумоўлены іх комплекснай распрацоўкай на розных метадалагічных узроўнях. На філасофскім узроўні дысертацыя ўлічвае прынцыпы гістарызму, спалучэння гістарычнай рэтраспектывы з перспектывай развіцця, дыялектычнай прыроды пазнання школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы ва ўзаемадзеянні яе кампанентаў і дэтэрмінуючых фактараў. На агульнанавуковым узроўні ў дысертацыі сістэмна даследуюцца і ўдакладняюцца структурныя кампаненты і функцыянал школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы ў працэсе яе эвалюцыі. На канкрэтна-навуковым узроўні ў даследаванні вывучана рэалізацыя ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі асяроддзевага падыходу, які пазіцыяніруецца праз прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя як сукупнасці дасягненняў беларускага народа ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, трансліруемых у працэсе выхавання і навучання, а таксама аксіялагічнага падыходу з акцэнтацыяй увагі на каштоўнасныя арыенціры вучнёўскай моладзі для аптымальнага і якаснага адбору зместа адукацыі.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечваецца выкарыстаннем вынікаў 13 навукова-даследчых работ, праведзеных з удзелам саіскальніка, а таксама практычнай рэалізацый вынікаў даследавання ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, Мінскім гарадскім і абласных інстытутах развіцця адукацыі, аб чым сведчаць даведка Нацыянальнага інстытута адуацыі і 9 актаў аб практычным выкарыстанні.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, абумоўлена непасрэдным удзелам саіскальніка у распрацоўцы Канцэпцыі «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» 2009 г., Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь 2022 г. (згодна з даведкай Акадэміі адукацыі), у падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі, гісторыі Беларусі, па вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» для агульнаадукацыйнай школы (згодна з актам Нацыянальнага інстытута адукацыі аб укараненні вынікаў дысертацыйнага даследавання).

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечана выкарыстаннем у якасці крыніцавай базы даследавання дакументаў і матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, што дазволіла раскрыць сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанню**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі заключаецца ў гісторыка-педагагічным характары праведезенага даследавання з акцэнтам на комплексны характар яго аб’екта як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з’явы. Таксама навуковая значнасць абумоўлена міждысцыплінарнасцю даследавання, якая ўлічвае канцэпты гуманітарыстыкі (гістарычная памяць, нацыя, нацыянальная ідэя, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, беларуская дзяржаўнасць, традыцыйныя каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства).

Практычная значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання пры рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, у прыватнасці, Камісіяй па навукова-метадычным забеспячэнні гістарычнай палітыкі пры Рэспубліканскім савеце па гістарычнай палітыцы. Вынікі дысертацыі могуць быць улічаны пры падрыхтоўцы новага пакалення школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры, пры правядзенні вопытнай праверкі вучэбнай літаратуры па гісторыі, на курсах павышэння кваліфікацыі і паслядыпломной перападрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі ва ўстановах дадатковай адукацыі дарослых. Вынікі даследавання маюць практыка-арыентаваны характар, што падцвярджаецца 9 актамі аб іх практычным выкарыстанні, даведкамі Нацыянальнага інстытута адукацыі і Акадэміі адукацыі. Практычная значнасць дысертацыі вызначаецца таксама ўлікам вынікаў праведзенага саіскальнікам анкетавання настаўнікаў і вучняў з мэтай выяўлення ступені іх адносін да прынцыпаў структуравання зместу, гістарычных падзей і асоб.

Эканамічная значнасць вынікаў дысертацыі звязана з працэсам падрыхтоўкі новага пакалення школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры з улікам кантэнт-аналізу папярэдніх пакаленняў вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, а таксама па вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь».

Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі заключаецца ў даследаванні школьнай гістарычнай адукацыі як асобнай сацыягуманітарнай з’явы. Пры гэтым значным з’яўляецца пазіцыяніраванне саіскальнікам гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як інтэграваных характарыстык асобы, фарміраванне якіх абумоўлена рэалізацыяй канцэпту беларускай дзяржаўнасці ў змесце адукацыі, прыняццем вучнямі прыярытэту дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей беларускага народа як рэгулятараў сацыяльных паводзін. Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі вызначаецца магчымасцю іх уліку пры ацэнцы чалавечага капіталу ў Рэспубліцы Беларусь, у прыватнасці, пры фарміраванні ў вучняў гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 83 публікацыях. З іх ліку 32 публікацыі адпавядаюць патрабаванням пункта 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Гэта – 1 манаграфія, 31 артыкул (з іх 2 – у сааўтарстве) у выданнях, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, у тым ліку 4 артыкулы ў замежных навуковых выданнях (Расійская Федэрацыя). Іншыя публікацыі, якія пацвярджаюць практычную значнасць дысертацыйнага даследавання, складаюць 9 артыкулаў (з іх 2 – у сааўтарстве) у іншых выданнях; 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац; 28 артыкулаў і тэзісаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый; 1 навукова-метадычны дапаможнік, 3 вучэбныя дапаможнікі (у сааўтарстве) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 3 вучэбна-метадычныя дапаможнікі з грыфам Нацыянальнага інстытута адукацыі. Агульны аб'ём публікацый па тэме дысертацыі складае 60,07 аўт. арк. Аб'ём аднаасобна апублікаваных саіскальнікам работ складае 38,70 аўт. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыйнае даследаване падрыхтавана і афармлена ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку афармлення дысертацыі, дысертацыі ў выглядзе навуковага даклада, аўтарэферата дысертацыі і публікацый па тэме дысертацыі, зацверджанай пастановай ВАК Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

Аўтарэферат поўнасцю адпавядае зместу дысертацыйнага даследавання, яго высновам і асноўным палажэнням, якія выносяцца на абарону.

**Заўвагі па дысертацыі**

Ацэньваючы ў цэлым станоўча прадстаўленую дысертацыю, лічым неабходным зрабіць наступныя заўвагі:

1. Канцэптуальна-метадалагічны кампанент школьнай гістарычнай адукацыі прадстаўлены ў тэксце дысертацыі фармацыйным, мадэрнізацыйным і цывілізацыйным падыходамі. Вядома, што ў сучаснай метадалогіі існуе шырокі дыяпазон падыходаў да вывучэння мінулага, у т.л. тэалагічны, эвалюцыянісцкі, мірсістэмны і інш. Метадалагічныя падыходы вызначаюцца навуковай пазіцыяй складальнікаў вучэбных праграм і аўтараў вучэбных дапаможнікаў. На наш погляд, падобны аналіз у даследаванні дазволіў бы больш дакладна зразумець працэс сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі для школьнай адукацыі, ступень аб'ектыўнасці прыведзеных фактаў, характар інтэрпрэтацыі мінулага, а таксама – асэнсаваць тэарэтыка-метадалагічныя асновы сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

2. Выклікае пытанне аб статусе мадэрнізацыйнага падыхода, калі сам саіскальнік вызначае яго вытворчым ад фармацыйнага падыхода.

Выкарыстанне мадэрнізацыйнага падыхода абмежавана канцом XIX – пачаткам XXI стагоддзяў (IX, XI класы).

3. У дысертацыі саіскальнік шырока аперыруе канцэптамі «гістарычная памяць», «нацыя», «нацыянальная ідэя», «беларуская дзяржаўнасць», «традыцыйныя каштоўнасці», «нацыянальна-культурная ідэнтычнасць». Гэтыя дэфініцыі – дыскусійныя, і яны неадназначна трактуюцца ў сучаснай гуманітарыстыцы. Хаця ў тэксце прысутнічае іх грунтоўны аўтарскі аналіз, на наш погляд, дысертацыі не дастае тэрміналагічнага слоўніка.

4. Саіскальнік у дысертацыйнай рабоце прадставіў перыядызацыю працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая мае 4 этапы. Дадзены глыбокі якасны аналіз кожнага этапа. Пры гэты было б пажадана назваць прычыны, якія вызначалі змену (пераход) да кожнай новай стадыі прадмета даследавання.

5. Для айчыннай гістарычнай навукі застаецца недастаткова вывучаным пытанне распрацоўкі школьнай вучэбнай літаратуры па сусветнай гісторыі. Саіскальнік у тэксце дысертацыі і ва ўласных публікацыях у большасці абаніраецца на вучэбны матэрыял па гісторыі Беларусі. Застаецца адкрытым пытанне аб месцы і ролі сусветнай гісторыі ў сістэме школьнай гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Названыя заўвагі не зніжаюць агульнай каштоўнасці дысертацыйнай работы і не ўплываюць на яе тэарэтычныя і практычныя вынікі, носяць рэкамендацыйны характар і могуць быць улічаны саіскальникам пры падрыхтоўцы дакладу, які прадстаўляецца да абароны.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Аналіз навуковага даследвання, праведзенага саіскальнікам, дазваляе зрабіць выснову, што дысертацыя Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» з'яўляецца самастойнай завершанай работай, якая сведчыць аб асабістым укладзе аўтара ў тэорыю і практыку школьнай гістарычнай адукацыі. Агульны аналіз дысертацыі, публікацый аўтара, удзелу саіскальніка ў навуковых канферэнцыях дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што кваліфікацыя Панова С. В. адпавядае навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі.

**Высновы**

Дысертацыя Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленая на саісканне вучонай ступені доктара педагагічных навук, з'яўляецца самастойным кваліфікацыйным даследаваннем, якое адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў, зацверджаным ВАК Рэспублікі Беларусь, прысвечана распрацоўцы навуковай праблемы развіцця

школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і ўтрымлівае прынцыпова новыя навуковыя вынікі.

Панову Сяргею Веніямінавічу можа быць прысуджана вучоная ступень доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі за:

– рэалізацыю міждысцыплінарнага гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай гістарычнай адукацыі з улікам спалучэння метадалагічных прынцыпаў гістарычнага пазнання (навуковасць, гістарызм, аб'ектыўнасць, прычыннаабумоўленасць, сістэмнасць, альтэрнатыўнасць, лагічнае абгрунтаванне, гуманізм, шматфактарнасць) і метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі (педагагічнасць, гістарычнасць, культуралагічнасць, сацыялагічнасць, паліталагічнасць, антрапалагічнасць, філасафічнасць);

– удакладненне і характарыстыку структурных кампанентаў (канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны) школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы, станаўленне і развіццё якой у Рэспубліцы Беларусь дэтэрмінавана дзяржаўнай гістарычнай палітыкай;

– сістэматызацыю метадалагічных падыходаў, якія рэалізаваны ў школьнай гістарычнай адукацыі: агульнапедагагічныя (культуралагічны і кампетэнтнасны ў іх пераемнасці); акадэмічна-гістарычныя (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны); прадметна-гістарычныя (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны);

– канструяванне структурна-зместавай мадэлі гісторыка-педагагічнага даследавання працэсу развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі (у складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыйна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў, якія адпавядаюць удакладненай структуры адукацыі);

– вызначэнне рэпрэзентатыўных працэсаў (афармленне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў канцэпцыях 1991, 2009, 2022 гг.; стандартызацыя ў адукацыйных стандартах 1998, 2009, 2018 гг., канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; рэалізацыя культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў; станаўленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі) для перыядызацыі чатырох этапаў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

– характарыстыку тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі (пераход ад прадметацэнтрызму да арыентаванасці на развіццё асобы; актуалізацыя прынцыпаў абнаўлення зместу праз антрапалагізацыю, культурна-гістарычнае асяроддзе, гістарычную дыялагічнасць; цыклічнасць у рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу; удакладненне кансалідуючай, кансерватыўна-пераемнай, контрнаступальнай, дзейнасна-паводзінскай функцый адукацыі);

– канцэптуалізацыю гісторыка-педагагічнага даследавання праз міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі, нацыянальнай ідэі,

нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства, якія ахарактарызаваны прадстаўнікамі навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізаваны ў змесце адукацыі;

– выяўленне перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі (нацыястваральны патэнцыял вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі», які рэалізуецца праз тэрытарыяльна-культурную і нацыянальна-дзяржаўную маркерызацыю зместу; актуалізацыя светапоглядна-выхаваўчай ролі школьнай гістарычнай адукацыі праз рэалізацыю сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі; удакладненне комплексу прынцыпаў адбору зместу, звязаных з місіяй і мэтавызначэннем адукацыі, далейшай распрацоўкай зместавых ліній, улікам каштоўнасных арыентацый вучняў, улікам траістай прыроды навукова-гістарычнага факта, пераадоленнем празмернай фактaлагічнасці зместу; інтэграцыя зместу гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі).

Афіцыйны апанент
дэкан факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму
ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Янкі Купалы»,
доктар гістарычных навук, дацэнт В.А. Белазаровіч

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела управления персоналом учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»
С.В. Нестерович
17. 02. 2025 г.